**УДК 930.1”15/16”**

# САЦЫЯЛЬНЫ КАПІТАЛ У КЛІЕНЦКАЙ СЕТЦЫ ЛЬВА САПЕГІ Ў КАНЦЫ XVI – ПАЧ. XVII СТ.

***канд. гіст. навук, дац. В. У. ЯКУБАЎ***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Артыкул прысвечаны структуры сацыяльнага капітала ў кліенцкай сетцы Льва Сапегі. На прыкладзе кнігі квітоў двара магната робяцца высновы аб living рознабаковасці сацыяльных сувязяў унутры сацыяльнай сеткі. Нягледзячы на наяўнасць і рост зямельнай уласнасці, асноўнай формай стварэння адносін паміж патронам і кліентамі з’яўляюцца ўжо грашовыя выплаты і таварныя выдачы. Акрамя таго, праз ахвяраванні і ўтрыманне сваякоў царкоўных саноўнікаў у складзе кліенцкай сеткі, прасочваюцца намаганні па стварэнні структурнай падтрымкі ў рэлігійнай і культурнай сферы. Палітычная апора на сваяцкія адносіны з беларускімі княжацкімі родамі на чале з Друцкімі і Лукомскімі дапаўнялася выдачай пазык і ўтрыманнем на юргельдзе прадстаўнікоў Пацаў, Валовічаў, Тышкевічаў, Тызенгаўзаў, Зяновічаў і Хадкевічаў.*

***Ключавые словы:*** *Леў Сапега, ВКЛ, магнатэрыя, служылая шляхта, васальна-кліенцкія сеткі, сацыяльны капітал.*

**Уводзіны.** Адной з самых удалых палітычных кар’ер ВКЛ эпохі Новага часу з’яўляецца кар’ера Льва Іванавіча Сапегі. Паходзячы з галіны Сапегаў, прадстаўнікі якой два пакаленні не траплялі на сенатарскія пасады, адвучыўшыся ў еўрапейскіх універсітэтах толькі два гады, але здолеўшы завалодаць і ўтрымацца ў фаворы пры двары і Стэфана Баторыя і Жыгімонта Вазы, ён напрыканцы жыцця стаў пярэднім сенатарам ВКЛ (адначасова і віленскім ваяводам і вялікім гетманам), а да таго, адным з найбольш уплывовых і заможных асоб усей Рэчы Паспалітай. Узлёт падобнага кшталту ў перыяд Новага часу быў немагчымы без моцнага сацыяльнага заплечча.

Нягледзячы на ўсю важнасць вывучэння гісторыі сацыяльных структур, у прыватнасці кліенцкай сеткі феадальнага “дома” Л. Сапегі, навуковая гістарыяграфія тэмы вельмі нешматлікая. Польскі гісторык міжваеннага перыяду Стэфан Інглот у 1931 г. на падставе “Кнігі квітоў Л. Сапегі за 1588 – 1607 гг.” з львоўскага Асалінэўма апублікаваў выдатны артыкул пра эканамічную структуру “двара” пад патранатам Л. Сапегі з вылучэннем асноўных крыніц прыбытку магнацкай гаспадаркі [1]. Але ў гэтым артыкуле няма інфармацыі аб выдатках Л. Сапегі на свае атачэнне і хаўруснікаў. Ужо ў наш час польскія гісторыкі працягваюць разглядаць гісторыю ВКЛ на вельмі высокім узроўні. Аркадыюш Чволэк выдаў у 2012 г. зробленую паводле сучасных навуковых патрабаванняў палітычную біяграфію Льва Сапегі [2] і атрымаў на яе ў 2015 г. не менш грунтоўную рэцэнзію ад Анджэя Рахубы [3]. Гэта рэцэнзія мела востры тон, размова ў ёй вялася аб акцэнтах пры напісанні біяграфіі, аналізаваліся факты і падзеі, узгадваліся персоны, але ў яе змесце не было матэрыялаў аб складзе структуры на чале якой стаў Л. Сапега. Тлумачыцца гэта вастрыня тым, што яшчэ перад выхадам манаграфіі А. Чволэка Анджэй Рахуба абагуліў праблематыку ведаў аб палітычнай фракцыі Сапегаў у невялікім артыкуле [4]. Уршуля Аўгустыняк стварыла выдатнае апісанне структуры ваеннай кліентэлы біржанскіх Радзівілаў [5, 6]. Анджэй Закшэўскі аспрэчыў шэраг міфалагем адносна біяграфіі Л. Сапегі [7].

Айчынная прафесійная гістарыяграфія на сённяшні дзень абмяжоўваецца артыкулам Анастасіі Скеп’ян, які абапіраецца на працы папярэдніх гісторыкаў і той дакумент, які будзе разгледжаны ў дадзеным артыкуле. Аднак сетка слуг і залежных у яе тэксце абмяжоўваецца “афіцыялістамі”, пад якімі разумеюцца амаль выключна арандатары маёнткаў [8]. Рэшта прац, прысвечаных прадстаўленай праблематыцы, – гэта навукова-папулярныя біяграфіі [9, 10], ці зборнікі артыкулаў [11, 12]. У выніку, на сённяшні дзень няма навуковых прац, якія б паспрабавалі аб’яднаць эканамічныя, сямейныя, палітычныя, рэлігійныя і культурныя інстытуцыянальныя сувязі, што прывялі да станаўлення такога гістарычнага феномена як кар’ера Льва Сапегі. Бо нягледзячы на індывідуальныя таленты, у закрытай станавай сістэме, без шматфактарнага заплечча і падтрымкі такі моцны сацыяльны ўзлёт і замацаванне на вяршыні грамадства наўрад ці былі б магчымыя.

Марксісцкая метадалогія, якая тлумачыла палітычныя кар’еры пераважна эканамічнымі дэтэрмінантамі, яўна саступае ва ўсеабдымнасці поглядам сацыёлагаў якія, пачынаючы з П. Бурдз’е, лічаць сацыяльным капіталам усе варыянты сувязяў ў грамадстве, якія могуць быць рэсурсам для атрымання выгодаў. Вылучаюць чатыры віды грамадскага капітала: эканамічны, сацыяльны (сувязі, у т.л. палітычныя), культурны (веданне кодаў культуры) і сімвалічны (прэстыж, гонар). [13]. На сённяшні дзень, націск у вывучэнні сацыяльнага капіталу яшчэ больш пераносіцца на нематэрыяльныя каштоўнасці, далучаючы

ў яго склад нормы, сувязі і давер. Механізм сацыяльнага капіталу выглядае наступным чынам: донар (патрон) дае рэцыпіенту (кліенту) нейкі карысны рэсурс, той у адказ служыць. Чым больш кліентаў тым мацней патрон. У гістарычнай навуцы мы можам прасачыць зафіксаваныя дакументальна сувязі і нормы. Барочны стыль камунікацыі паміж роўнымі прадпісваў ветлівы зварот праз "пан" і "службу" адно аднаму, таму характарыстыка культурнага капіталу будзе прадметам іншых даследванняў. Задача ж дадзенай публікацыі на падмурку раней цалкам не аналізаванага дакумента [14] раскрыць структуру сацыяльнага капіталу пры двары Льва Сапегі ў першыя два дзесяцігоддзі яго кар'еры ў кіруючай эліце Рэчы Паспалітай.

**Асноўная частка.** У "Квітах" запісы пачынаюцца з 1591 г., на той момант, калі Л. Сапега ўжо 2 гады як быў вялікім канцлерам ВКЛ, трымаў Маркаўскае і Магілеўскае староствы, валодаў маёнткамі каля Талочына, Коханава, Горак, Чарэі, Белай (Лепеля), Лемніцы, Маладзечна, Мядзеля, а таксама Мендзырэчча на Падляшшы. Пашыраючы прыватную ўласнасць, у 1598 г. вялікі канцлер ВКЛ набыў Ружану, Зэльву, Ласосна ў Слонімскім павеце [8, с. 29]. Зямельныя набыткі дадалі эканамічнай моцы палітычнай прысутнасці ў павеце, існаваўшай з 1586 г. у выглядзе трымання Слонімскага судовага староства. Больш таго, Слонім, а пазней Ружана, сталі адной з рэзідэнцый яго сям'і.

Паводле "квітоў", у склад структуры дома і двара Л. Сапегі ўваходзіла некалькі катэгорый залежных і працуючых на патрона высакародных кліентаў і "паспольства". Першымі ў спісе ідуць 44 "служэбнікі" з расшыфроўкай "слугі". Другая па чарзе група – юргельднікі (13 чалавек) і трэцяя – "ўраднікі" (15 асоб). У чацвертую катэгорыю "каморнікі" можна аднесці 80 прозвішчаў, але насуперак меркаванню А. Скеп'ян [8, с. 37], да каморнікаў нельга адносіць выключна зборшчыкаў чыншаў па маёнтках, бо гэтым жа тэрмінам абазначаліся і мытныя чыноўнікі на каморах ВКЛ. Магчымасці прызначаць мытных чыноўнікаў, здаваць пасады ў арэнду, былі важнай крыніцай прыбытку і ўлады, паколькі ў апошняе дзесяцігоддзе XVI ст. Л. Сапега становіцца арандатарам мытаў ВКЛ. Кантроль над персанальным складам мытных каморнікаў быў відавочным, аб чым сведчыць пагроза ад полацкай і віцебскай шляхты выклікаць Л. Сапегу і К. Радзівіла позвамі на суд у 1599 г. за злоўжыванні іх слуг на мытнях [15, с. 224; 16].

Для гаспадарчага персаналу пры двары вялікага канцлера ўжываецца тэрмін "служкі" (каля 28 асоб). У складзе служак указаныя кухмістр Ферэнц і памочнікі, доктар Корп, Бальцэр – цырульнік, Адам – капелан, арганіст, трубач і хор з распісаннем галасоў (тэнар, бас і г.д. – 10 чал.), спрачка, агароднік, цясляр, стольмах, каваль, паляўнічы і інш., але няма нікога, адказнага за карэты, коней і стайню, што выглядае дзіўна для двору пастаянна вандруючага прыдворнага. [14, арк. 93 – 82].

У якасці "ўраднікаў" у "квітах" пазначаны ў асноўным арандатары ўладанняў і трыманняў Л. Сапегі: Божэмінскі (Мацей) – "намеснік іказанскай маетнасці" ў 1592 – 1600 гг. [1, с. 182, 170], субарэндатар новападвышаных мыт ВКЛ [1, с. 203]; Пшэстаноўскі (Добрагост) – трымальнік староства Ясвоньскага ў 1595 – 1600 гг. [1, с. 184], а пазней, загадчык Ковенскай мытні [1, с. 207]; Водэрацкі (Мікалай) – трымальнік Рэтаўскага маёнтка ў 1596 – 1600 гг. [1, с. 184]; Пашкоўскі (Ян) – "намеснік" Маркаўскага староства ў 1589 – 1594 гг. [1, с. 183]; Галенскі (Ян) – "намеснік" у Блудзенскім старостве [1, с. 185]; (? Іржы [8, с.34]) Блінкструп; Рубец (Шымон) – арандатар Лемніцы ў 1598 – 1602 гг. [1, с 181], Талочына ў 1604 – 1606 гг. і "воласці Якаўлевіцкай і Басейскай за Дняпром лежачых" 1604 – 1607 гг. [1, с. 182]; Літэцкі (Ежы) – трымальнік мястэчка Суша з усімі прыбыткамі і азёрамі і млыном ў 1594 – 1597 гг. [1, с. 182]; Печыньскі (Войцэх?) – трымальнік "Ясенага і Странёцага з усім і баярамі і паданымі" [1, с 180]; Грахоўскі (Ян) – трымальнік маёнтка Медзырэча і 2 фальваркаў: Воршэ і Бярозы [1, с.180]; Енджэйскі – верагодна, Іван Енджэёўскі (Андрыеўскі) – уніяцкі біскуп Хелмскі і Бэлзскі ў 1604 – 1619 г.; а таксама бліжэй не знаныя Косаўскі, Валенты, Залескі (Корсак?). Такім чынам, большасць з ураднікаў вядомыя нам з працы С. Інглота, але не ўсе пералічаныя былі намеснікамі ці арандатарамі.

Трыманне зямельнага надзела было далёка не адзіным спосабам арганізацыі сацыяльных структур ВКЛ у эпоху Новага часу. У рэчаіснасці, не прывязаная да васальнага надзелу шляхта сама выбірала з кім і на якіх умовах заключаць пагадненні, да якога магнацкага дому "прыстаць" і калі ад яго "адстаць". Сетка такіх шматаб'ектных міжродавых адносін і стварала структуру шляхецкага стану. Традыцыйнае грамадства – карпаратыўнае па сваёй сутнасці. Статус у межах карпарацыі (страты) вызначае наяўнасць пэўнага віду сацыяльнага капіталу. Асобна вылучаная ў "квітах" катэгорыя "ўраднікаў" – субарандатараў маёнткаў была нешматлікай. Для двару Л. Сапегі асноўным эканамічным спосабам утрымання слуг была выдача ім грошай і тканіны. Сацыяльны і палітычны капітал складалі асабістыя і сямейныя сувязі ў цэнтрах прыняцця рашэнняў, выкарыстанне службовага статуса і магчымасць размяркоўваць пасты ў цікавых для кліентаў структурах.

Акрамя адміністрацыйных і эканамічных чыннікаў, звычайных пры матэрыялістычных трактоўках, паводле сучасных сацыялагічных, не менш важным дзеля трываласці пазіцый роду ва ўсіх сістэмах грамадства з'яўляецца культура – прызнанне грамадствам сацыяльнага статуса і законнасці набытага багацця. Ацэнка маральнасці – суаднясенне дзеянняў з пэўнай шкалой каштоўнасцей. У сучасным грамадстве ролю стваральнікаў і кантралёраў маральных арыенціраў выконваюць дзеячы культуры, а для традыцыйных грамадстваў – прадстаўнікі рэлігійных інстытутаў.

Прэстыж у тагачасным грамадстве забяспечвалі не толькі даўнасць і пазіцыя роду. Высокім статусам уласна бацька Л. Сапегі, Іван Іванавіч, пахваліцца не мог. У адрозненне ад прадстаўнікоў кодэньскай лініі Сапегаў, якія былі ваяводамі, той даслужыўся толькі да драгічынскага старасты і аршанскага падстарасты. Але маці Л. Сапегі была апошняй прадстаўніцай роду Канопляў, аднаго з адгалінаванняў дому князёў Друцкіх, якія паходзілі з колішняй полацкай княскай дынастыі. Пра вагу лакальнай ідэнтычнасці ў бацькоўскай сям'і вельмі яскрава сведчыць тое, што родныя браты вялікага канцлера абралі для сваіх кар'ер Аршанскі павет, а ў "квітах" залежныя ад Л. Сапегі прадстаўнікі высакароднага стану ўзгадваюцца паводле двух тытулаў – "князі" і "паны". Статус "князь" ("dux, ці "герцаг") па азначэнні вышэй за "пана" – выслужаную шляхту. Большасць з князёў-кліентаў маюць дачыненне да дому Друцкіх. Сваяцкія сувязі забяспечылі Л. Сапегу інфармацыйнай і структурнай падтрымкай у Падняпроўі і Падзвінні. Сувязі княскіх дамоў усходняй Беларусі дапамаглі яму стаць асноўным спецыялістам па маскоўскіх пытаннях пры двары і быць мастом паміж "руссю" ВКЛ і віленскай палітычнай элітай. Л. Сапега, у сваю чаргу, забяспечваў ім прызначэнні на пасады [17], удзел у інспектаванні і інцыяванні новых, выгодных зборшчыкам, падаткаў на мясцовую інфраструктуру (паўграшовага збора з купецкага каня і ваза на рамонта дарог паміж Полацкам, Оршай, Барысавам, Магілёвам і Мсціслававам) [18], імкнуўся да трывалага міру з Масквой – найбольшай пагрозай для дабрабыту ўсходніх земляў ВКЛ.

Усяго ў "квітах" значыцца 5 князёў, (або 8, калі лічыць двойчы ўзгаданых без імя Саколенскага і Масальскага рознымі людзьмі). Верыфікаванымі дакладна можна лічыць "слугу" Януша (Бабіча) Саколенскага, і "каморніка Крыштапа Масальскага. Удакладненню падлягаюць не названыя па імю князі-"слугі" Горскі і Лукомскі, а таксама "каморнікі" Жыжэмскі (або Геранім, падкаморы мазырскі, або Петр ці Яраш – старасты рэчыцкія ў 1599 г. і 1609 г. [19, с. 201], [20, с. 89]), Саколенскі і Масальскі. Князі Жыжэмскія, Масальскія і Лукомскія не ўваходзілі ў дом Друцкіх, аднак былі шматкроць парадненнымі з ім. Князі, часцей за ўсё, не былі яго "павіненнымі" слугамі, а іменаваліся "прыяцелямі", калі ад іх было нешта трэба, або маглі мець нейкія пазыкі ці паслугі ад патрона.

Князі Лукомскія хутчэй за ўсе ў кліенцкай сетцы Л. Сапегі былі прадстаўленыя кімсці з шчыдуцкай лініі роду. Так, Раман Бальтазаравіч – уласнік Лужкоў, Рудні і інш. быў жанаты з Аленай Яраслаўнай Жыжэмскай. Але хутчэй за ўсё ў квітах значыўся ўжо ўзгаданы Фрыдэрык – Фёдар Багданавіч, які да 1592 г. быў студэнтам ў Падуі, потым каралеўскім сакратаром, з 1600 г. падкаморым аршанскім, з 1602 г. старостам крычаўскім, кашталянам мсціслаўскім (1610 – 1611 гг.). Яго сыны прадалі маёнткі Сапегам і перасталі ўжываць княжацкі тытул [20].

Квіты фіксуюць адносіны ўзаемазалежнасці ў межах кліенцкай сеткі наступным чынам: спачатку на дзень святога Яна 1591 г. скарб Л. Сапегі быў вінен не названаму па імю князю Лукомскаму 80 (коп)[1]. Суму пакрылі выданыя неназванаму князю Лукомскаму 28 верасня 1591 г. – 180 коп, потым ў 1592 г. ён жа атрымаў – 60 і 40, а потым 1593 – 1594 гг. – яшчэ 4 траншы па 40 коп адзін з якіх тканінай – фалькендышам. Відаць, быць пры двары было яго абавязкам, бо 1 жніўня 1593 г. зазначана, што "з рахунку для частай абсэнцыі (адсутнасці) ніц яму ня вінна" [14, арк. 37аб.].

Таксама без значных цяжкасей працякала супрацоўніцтва ў не названага па імю князя Горскага, які "прыстаў" да дома Л. Сапегі ў Варшаве 17.07.1592 г. За наступныя 3 гады князь набраў да 220 коп пазыкі, якія 12.12.1594 г. перад выездам з Варшавы "яго міласць (Л. Сапега) яму дараваць зрабіў ласку"[14, арк.40]. Верагодней усяго, ім быў Юры Абрамавіч Горскі, які купіў у Л. Сапегі за 4000 злотых маёнтак Горы ў Аршанскім павеце і падпісаў адмову ад прытэнзій да папярэдняга яго ўладальніка, Андрэя Цеханавецкага, у 1598 г. [21, с. 148]. Цеханавецкія, па жаночай лініі, былі спадчыннікамі мсціслаўскіх князёў.

Сенатарскія пасады мсціслаўскага ваяводы і кашталяна часта былі трамплінам для далейшага кар'ернага росту магнатаў. Але самі яны рэдка жылі на гэтым далёкім памежжы. У канцы XVI ст. ваяводамі мсціслаўскімі былі Павал Пац (1578 – 1593) і Геранім Хадкевіч (1593 – 1595), Станіслаў Нарбут (1595 – 1596), Ян Кезгайла Завіша (1596 – 1596), Пётр Дарагастайскі (1600 – 1605), Андрэй Сапега (1605 – 1611).

З гэтага пераліку толькі Я. Завіша быў адносна незалежнай фігурай. Але калі ён пайшоў на пасаду ваяводы Віцебскага (1600 – 1626), дзе змяніў Мікалая Сапегу, пры ім кашталянам Віцебскім (1594 – 1600) быў Ян Янавіч Зяновіч (каля 1550 – 1614), які яшчэ ў бытнасць падстоліем ВКЛ у 1593 г., атрымаў ад Л. Сапегі 1000 і 1875 коп [14, арк. 33], а пазней, стаў смаленскім кашталянам (1600 – 1614). Больш таго, на пасадзе войта Віцебскага з 1598 па 1603 г. знаходзіўся на той момант слуга і юргельднік Л. Сапегі – Аляксандр Гасеўскі. Дарагастайскія на той момант атрымлівалі падтрымку Крыштофа Радзівіла Пяруна. Нейкі Нарбут быў выкрэслены са спісу ў квітах, як былы каморнік [14, арк. 460].

Леў Сапега меў фінансавыя справы не толькі з мужчынамі. Так, у 1598 г. яму прышлося выдаць 11 250 коп "пані Валовічавай" [14, арк. 34] за вялізарны доўг Яна (Пятра?) Сапегі ў 20 500 коп. Верагодней усяго, ёй была Сафія з Валовічаў, жонка вялікага падскарбія ВКЛ Андрэя Завішы [22].

---

[1] Дакумент пачынаецца з пералічэння сум у літоўскіх копах, потым пры персанальным пераліку выплат указваюцца лічбы, але замест валюты ідзе скарачэнне – ff. Дапускаем, што ўвесь падлік – у літоўскіх копах.

Жонка іншага магната – канюшага ВКЛ (Геранiма Юр’евіча) Хадкевіча – у сакавіку 1593 г.у Вільні была павінна скарбу Л. Сапегі 5000 коп [14, арк. 33]. Ці то са з’яўленнем грошай, ці то з іншай нагоды, але ў 1593 г. кар’ера яе мужа пайшла ўгару. Геранім Юр’евіч Хадкевіч стаў ваяводам Мсціслаўскім (1593 – 1595), а потым кашталянам віленскім і старостам Берасцейскім (1595 – 1617). Геранім Хадкевіч з 1595 г. пераняў апекунства над спадчыніцай Слуцкіх князёў – Сафіяй Алелькавіч, – спроба адмовіцца ад выдання якой замуж за Януша Радзівіла ледзьве не стала прычынай вайны паміж Радзівіламі і Хадкевічамі ў 1600 г. Паколькі паводле ўласных лістоў сам Леў Сапега адносна К. Радзівіла Пяруна называў сябе“слугой”, Г. Хадкевіч наўрад ці імкнуўся быць асабіста вінным яму і перадаручыў пазыку жонцы.

На пасадзе кашталяна віленскага, як і мсціслаўскага ваяводы, Геранім Хадкевіч замяніў Паўла Паца, які памер у 1595 г. Абодва магнаты былі даўжнікамі вялікага канцлера. На 5.01.1590 г. віленскі кашталян (Павел Пац) быў вінен скарбу Л. Сапегі 6000 + 750 коп [14, арк. 25] і, відаць, нехта з яго сыноў значыцца як “ваяводзіч Пац” у спісе юргельднікаў Л. Сапегі [14, арк. 35].

Сведчаннем узаемнай выгоды і сувязі была выплата суддзі земскаму ваўкавыскаму, войскаму гарадзенскаму, Рыгору Войне, ў 1593 г. 500 коп [14, арк. 33]. Рыгор у тым жа годзе стаў сенатарам – кашталянам Берасцейскім (1593 – 1603), а потым на той жа пасадзе яго замяніў родны брат, Сокал Война, (да гэтага ў 1599 – 1603 гг. быў таксама сенатарам – кашталянам Мсціслаўскім). У Войны Мацьвеевіча Грычыны было 5 сыноў. Роднымі братамі акрамя Рыгора і Сокала быў маршалак гаспадарскі Сямён (памёр у 1599 г. і ад яго мсціслаўскае каштэлянства перадалі з-за “паважанасці роду” яго брату Сокалу [23], але большыя кар’еры зрабілі – вялікі пісар ВКЛ і падканцлер ВКЛ Габрыэль Война (1589 – 1615) і Бенэдыкт Война – з 1594 г. адміністратар віленскай дыяцэзі і біскуп Віленскі (1600 – 1615). Адзначым, Бенэдыкт атрымаў пасаду пасля працяглага супраціўлення шляхты ВКЛ начале з тымі ж біржанскімі Радзівіламі і Сапегамі жаданню Жыгімонта Вазы прызначыць паляка на пасаду віленскага біскупа. Стаўшы першым царкоўным сенатарам ВКЛ, Бенэдыкт Война правеў паўторную кананізацыю Св. Казіміра, як патрона Літвы, чым сімвалічна замацаваў аўтаномію ВКЛ ад Польшчы. Сума, выдаткаваная Л. Сапегай Віленскай капітуле ў 1593 г. – 750 і 1594 г. – 6000 + 750 коп з непазначанымі мэтамі [14, арк.33-33 аб.]. Сума была большая за ахвяраванні Жыгімонта Вазы ў 4000 зл., на якія быў рэканструяваны будынак Віленскага кафедральнага сабора.

Ня толькі Габрыель Война, імя якога, дарэчы, няма ў “квітах”, быў супрацоўнікам Л. Сапегі ў канцэлярыі ВКЛ. Сямён Цярлецкі (Тарлецкі) з Пачапава на Піншчыне, разам з сынам Ярашам (Рыгорам, Георгіем) былі пісарамі ў канцыляры ВКЛ, аб чым маюцца сведчанні ў некалькіх кнігах метрыкі ВКЛ (кнігі з 1585 па 1614 г.). Яраш Цярлецкі па хадатайніцтве Л. Сапегі ў 1590 г. стаў не толькі падстоліем Пінскім, але і судовым войтам Менскім [24, с. 71], і трымальнікам Габровіцкай і Пацюкоўскай воласці свайго патрона ў 1603 – 1604 гг. [1, с. 184].

Яраш (Грыгоры) Цярлецкі ў “квітках” класіфікаваны як “слуга” [14, арк. 1, 35, 36]. У 1592 г. з 400 коп маскоўскага мыта на юргельды пайшло 220 коп – “пану Волку на адправу да Масквы 60 коп., на стрававання паслоў маскоўскіх а слуг маіх Галубіцкага (Яна Рыгоравіча Корсака) і (Яраша) Цярлецкага – 100” [14, арк.1]. Акрамя таго, на выплату 100 коп у 1591 г. новаму маскоўскаму паслу і менскаму войту ў Наваградку прыцягваўся нейкі не названы па прозвішчы Лукаш (Мамоніч?), а 1.08.1592 г. 200 коп яму выдалі полацкія мяшчане [14, арк. 36]. Адзначым, віленец Лукаш Мамоніч, скарбны ВКЛ, брат віленскага бурмістра, 24.05.1592 г. пазычыў Л. Сапеге першую частку сродкаў – 6000 коп, на арэнду мытаў ВКЛ [14, арк.1]. Ён жа быў партнёрам па выдавецтве трэцяга Статута ВКЛ і карыстаўся сапежынскім гербам “Ліс”. Выдача сродкаў і карыстанне гербам сведчыць аб надзейнасці сувязяў Л. Сапегі з мяшчанскімі коламі ВКЛ.

З пункту гледжання логікі выбудовы кліенцкай сеткі важна, што Яраш Цярлецкі быў родным братам Кірылы Цярлецкага – епіскапа Луцкага (1585 – 1607), аднаго з найбольш актыўных стваральнікаў Берасцейскай царкоўнай уніі. Пра тое, што браты падтрымлівалі сувязь усё жыццё, сведчыць той факт, што менавіта менскі войт Яраш вывез цела памерлага ў 1607 г. епіскапа Кірылы і частку яго маёмасці з Луцка ў Перкавічы. Такім чынам, бацька і родны брат Кірылы Цярлецкага былі падначаленым і слугой у складзе двара Л. Сапегі.

Князь Жыжэмскі разам са стольнікам Мазырскім Стэфанам Лавейкам (род Лавейкаў меў полацкае паходжанне), верагодна, забяспечвалі ўплывы канцлера на ўсходнім Палессі. Да гэтай групы адносіцца і пан (?) Судоскі [1, с. 170] які трымаў у арэндзе ад Льва Сапегі Чарнобыльскае староства. Староства гэтае, як і Аршанскае – Сапегі пераняли ў Філона Кміты. Стрыечны брат Л. Сапегі, Лукаш Міхайлавіч Сапега, ажаніўся з Сафіяй Кмітай, якая ў пасазе ў 1597 г. прынесла Чарнобыльскую воласць. Другая дачка Ф. Кміты таксама пайшла замуж за прадстаўніка дома Сапегаў – Юрыя Друцкага Горскага. Дом Сапегаў замацаваўся на поўднёвым усходзе ВКЛ палітычна, а на поўначы Кіеўскага ваяводства – сацыяльна-эканамічна.

Актыўны ўдзел у рэлігійным жыцці павінен быў рэабілітаваць і павысіць сацыяльны прэстыж хутка ўзрастаючаму эканамічнаму і палітычнаму капіталу канцлера ВКЛ. На грошы Л. Сапегі былі пабудаваныя і ўтрымлівалася шмат цэркваў, касцёлаў і кляштароў. На той момант Л. Сапега – каталік, які падтрымліваў не

толькі сваю канфесію ў асобе братоў Войнаў, але меў непасрэдны ўплыў на вярхушку грэка-каталіцкага кліра ў асобе родных К. Цярлецкага. Найбольш значнай фундацыяй была пабудова ў 1593 – 1625 г. кляштара Бернардзінак і касцёла Святога Міхала ў Вільні – задуманага і рэалізаванага як радавая ўсыпальніца для Л. Сапегі і яго нашчадкаў. Але адносіны з клірам мелі двухбаковы характар.

Прадстаўнік касцела, ксёндз Адам, фактычна быў фінансавым агентам Л. Сапегі ў Кракаве. У 1594 г. ён двойчы выдаў князю Горскаму грошы – 20 і 220 коп, пану Стравінскаму, які "прыстаў да дому" Л. Сапегі ў Менску, у тым жа годзе і там жа – 40 і 50 коп [14, арк. 43аб.], а пану Карачуну ў 1594 г. – 40 коп. Трымальнікам Вострынскага староства ад Л. Сапегі ў 1589 – 1602 гг. быў ксёндз Андрэй Віленскі [1, с. 185]. Цікавымі, з пункту касцельных норм, запісамі з'яўляецца выплата ў 1593 г. "патомкам ксяндза Немчыновіча" – 500 коп [14, арк.33], фіксацыя касцельных рэчаў у тым ліку іказаньскіх [14, арк. 81–84] і заключэнне ўмовы з іказаньскім ксяндзом Станіславам [14, арк. 100–101].

Абавязаны пачаткам кар'еры Крыштофу Радзівілу Пяруну, кальвіністу па веравызнанні, Л. Сапега не адмаўляўся і ад падтрымкі рэфарматаў: імі былі ўзгаданы вышэй Ян Янавіч Зяновіч і (Саламон?) Рысінскі. Апошні знаходзіўся ў складзе "слуг" з 1591 па 1595 г., атрымліваў значныя сумы грошаў. Так, у 1592 г. – 50 і 60 коп [14, арк. 40], у 1593 г.– выданыя і спісаныя 150 [14, арк. 28 аб.] у 1594 – 235 коп [14, арк. 40], у 1595 – 180, а "на адстанню" 25 ліпеня 1595 г. – 140 [14, арк. 40]. Акрамя таго, у складзе двара былі немцы-фактары Мельхер-немец [14, арк. 51], Уладзімір Ургеймер Мемер, Фаўстын Кляйн [14, арк. 53аб.]. Іх задача была забяспечваць інтарэсы патрона ў Рызе, Мемелі і Данцыгу – ўжо пратэстанцкіх гарадах.

Важным элементам узняцця прэстыжу і замацавання будучых кліентаў з'яўлялася гуманітарная дзейнасць. "Рыцарскія цноты" ўключалі ў сябе падтрымку ўдоў і моладзі "шляхетных брацці". Пазней удзячныя або станавіліся на службу, або захоўвалі прыязнасць да дому дабрадзея. Гуманітарная дзейнасць уключала ў сябе непасрэдныя выплаты, утрыманне або адмову ад спагнання запазычаннасцей. У 1593 г. былі спісаныя (зафіксаваныя) даўгі на маёнтках пані Мілашэўскай – 400 коп, пані Сіромскай – 300, пані Мач(с?)альскай – 1000, Юрку Халінсцы – 500, вайтовічу Іказненскаму – 500, Рысінічу – 150, пані Любавецкай – 300 [14, арк. 28аб.], пані Прыбароўскай на 2000, Валчку на старастве Кар'якоўскім – 2500 коп [14, арк. 34]. Даўгі на маёнтках (іменіях) Стараселля Віцебскага павету ў 12 500 коп пайшлі на вяртанне пазыкі Яна Сапегі Валовічаўне [14, арк. 34] і на падтрымку сястры Л. Сапегі, Тэадоры, якая была замужам за Мацеям Ленэкам, на той момант, старастам Навагародска – інфлянцкім і кірхгольмскім, з 1598 г. – кашталянам дэрпцкім. Другая родная сястра канцлера – Марыяна\Сафія – была ў шлюбе з Марцінам Курчом старастам фелінскім, з 1598 г.– ваяводам дэрпцім, а трэцяя – Ганна – за Міхалам Францкевічам Радзімінськім, полацкім падкаморыям, дзяржаўцам дрыскім [25, с. 164; 26, с. 257]. Як толькі ў 1598 г. ваявода і кашталян ад Дэрпта сталі сенатарскімі крэсламі – абодва атрымалі швагры Л. Сапегі.

Дапамога шваграм была не толькі палітычнай. Так, М. Ленэку і яго жонцы было перададзена спачатку 1500, а потым яшчэ 1000 коп [14, арк 25 і 34], М. Курчу ў 1591 – 1594 гг. выдавалі тканіну (чырвоны і брунатны адамашак, сукно фалькендыш) коштам па 15 – 40 коп, футра і грошы ад 5 да 40 коп. [14, арк. 47 аб.], а М. Францкевіч у "квітах", верагодна, пазначаны ў якасці юргельдніка [14, арк. 35].

Жонкі Сапежанкі жылі са сваімі мужамі ў Інфлянтах і Полацку, прадстаўляючы інтарэсы сям'і на мясцовасці, а іх маёмасцю і ўтрыманнем кіравалі слугі брата-патрона. Напрыклад П. Галінскі атрымаў "на частцы старасцінай Навагрáдскай – 2000, яму ж на старастве аршанскім далі 2500" [14, арк. 34]. Заўважым, што М. Ленэк быў палякам і палітычную кар'еру рабіў як прадстаўнік Кароны ў Інфлянтах. Але не толькі ён трапляе ў залежнасць. З разлікам выйсці на род Казаноўскіх, уплывовы ў інфлянцкай каланіяльнай адміністрацыі і сярод каронай шляхты, Л. Сапега выдаў у 1591 г. 3000 коп [14, арк. 25] і 3000 ў 1593 г. [14, арк. 33] Анджэю Казаноўскаму. Але аб кар'еры А. Казаноўскага на сёння нічога не вядома.

Як вядома, сам Л. Сапега пачынаў кар'еру ў складзе аршака-суправаджэння маладых Радзівілаў [27]. Таму ў складзе яго двара, таксама была высакародная і перспектыўная моладзь. Выплочваць сталае ўтрыманне – юргельд – было не толькі прэстыжна, але і абяцала прыхільнікаў для дому ў будучым. Усяго ў квітах налічвалася 13 юргельднікаў: Паліт(к?)анскі, Фрыдрыхавіч, Павал Сколэк(?), Бруховіч (?), Ваяводзіч Пац, Ваяводзіч Цішкевіч (Тышкевіч), Валовіч Самуэль, Ферэнс, Храдановіч(?), Францкевіч (Міхал), Кендзі(?)шэўскі(?), Готард (Тызенгаўз?) ці (Лукаш) Готард, Гасеўскі (Аляксандр) [14, арк. 35].

Адзіным цалкам напісаным імем у спісе быў Самуэль Валовіч. Ён далучыўся да дома Сапегаў у Варшаве 8.05.1596 г. [14, арк. 41аб.]. Верагодна, утрыманне гэтага ўжо сталага мужчыны, было ўдзячнасцю Валовічам за падтрымку і пераняццё вялікай канцыляры ВКЛ і Слонімскага староства. Далей у спісе юргельднікаў ідуць два невядомых па імю "ваяводзічы": Пац і Тышкевіч. Найверагодней, малады Пац – нехта з сыноў ваяводы Мсціслаўскага і кашталяна Віленскага Паўла Паца – Петр ці Мікалай. Што датычыцца ваяводзіча Тышкевіча (Цішкевіча), хутчэй за ўсе, ім быў Януш Фёдаравіч – сын ваяводы Навагрáдскага і старасты Браслаўскага (1588 – 1610) Тэадора Скумін Тышкевіча [28, с. 682]. Супрацоўніцтва з імі зафіксавана у 1591 г., калі нейкаму Ц(Т)ішкевічу скарб ВКЛ выдаў 200 коп на рэвельскай сустрэчы каралёў Вазаў, разам з кухмістрам ВКЛ Мікалаем Сапегам 26 коп 56 гр, і (Янам) Чыжом 240 коп [14, арк. 1].

Ферэнс – хутчэй за ўсе нашчадак Ферэнса-венгра – піўнічага ВКЛ пры Стэфане Баторыі. Нейкі "Ферэнс-кухмістр прыстаў да двара" ў 1597 г. [14, с. 40], а яго сын "кухміستравіч" паводле "квітоў" таксама быў на ўтрыманні скарбу Л. Сапегі [14, арк. 96]. Фрыдрыхавічам мог быць Даніель Шчыт-Забельскі, ці нехта з сыноў Ветрынскіх Эпімахаў, або князя Ф. Лукомскага. Хутчэй за ўсё Готард – гэта Готард Ян Тызенгаўз – пазней ротмістр у Інфлянтах, жанаты на Сусане, дачцы ўсвяцкага старасты Яна Пятра Сапегі [29, с. 186]. З меньшай верагоднасцю, юргельднікам мог быць Лукаш Готард, ўзгаданы ў 1601 г., як слуга слонімскага падляснічага Станіслава Рэмбеўскага [8, с.46]. Францкевічам хутчэй за ўсе быў Міхал Францкевіч Радзіміньскі – швагра Л. Сапегі, а панам Гасеўскім – Аляксандр Гасеўскі, будучы войт Віцебскі, пазней ваявода Смаленскі [30].

**Заключэнне.** Такім чынам, Л. Сапега валодаў досыць разгалінаванай сістэмай сацыяльных сувязяў, якія меліся ў сферы эканомікі, палітыцы і рэлігіі. Трывалыя эканамічныя пазіцыі былі замацаваныя ў трыманнях і ўласнасцці ў Віцебскім, Полацкім, Віленскім, Троцкім, Наваградскім, Менскім, Інфлянцкім ваяводстве і Жамойці. Адпаведна, непасрэдных эканамічных інтарэсаў не было толькі ў Берасцейскім і Мсціслаўскім ваявостве ВКЛ, але там мелі моцныя пазіцыі слугі і палітычныя саюзнікі – "прыяцелі" дома Сапегаў. Квіты фіксуюць выплату і выдачу тавараў як асноўную форму падтрымання сувязі.

Грашовыя магчымасці Л. Сапегі абапіраліся не толькі на маёмасць, але і на саюз з Мамонічамі і мяшчанскімі фінансамі Вільні, Полацка, Рыгі і інш. Наяўнасць у складзе двара служак, адказных за кухню, музыку, медыцыну, а так сама капелана, сведчаць не толькі аб камфортнасці побыту, але і аб шырыні густаў і магчымасцях прэзентацыі высокай культуры пры двары Л. Сапегі.

У дадатак да эканамічнай магутнасці выкарыстанне палітычных статусаў: канцлера, арандатара мытаў, "куратара маскоўскіх спраў" стварылі Л. Сапегу вялікую сетку кліентаў (больш 150 асоб). Яе ўдзельнікі паходзілі з розных рэгіёнаў ВКЛ, больш таго, у яе складзе былі прадстаўнікі розных земляў і народаў Польскай Кароны і немцаў, што зрабіла яго цікавым і моцным партнёрам дзеля выгодных палітычных кантрактаў. У арыстакратычных колах сімвалічны палітычны капітал базаваўся на альянсе з "даўнімі" беларускімі княскімі родамі Друцкіх і Лукомскіх. Пашыраючыся на захад і ў сталіцу ВКЛ, кліенцкая сетка Л. Сапегі завязвала пачаткова няроўныя партнёрскія сувязі з біржанскімі Радзівіламі і кодэньскімі Сапегамі, Валовічамі, Войнамі і Пацамі. Росту сацыяльнага капіталу спрыяла выдача пазыкаў у грашовай і натуральнай форме, дапамога сіротам і жанчынам і ўтрыманне на юргельдах прадстаўнікоў моладзі Валовічаў, Пацаў, Тышкевічаў і Зяновічаў. Фундацыя цэркваў, падтрымка святароў і іх сем'яў (Войнаў, Цярлецкіх, Рысінскіх) усіх хрысціянскіх вераспавядаданняў забяспечвала палітычны ўплыў і падмацоўвала сацыяльны прэстыж у шматканфесійным грамадстве ВКЛ. Структура кліенцкай сеткі, якая ўключала прадстаўнікоў арыстакратычных родаў, ураднікаў маёнткаў, служылую шляхту, святароў і дзеячоў культуры сведчыць аб высокай ступені ў яе складзе сацыяльнага, эканамічнага, культурнага і сімвалічнага капіталу.

ЛІТАРАТУРА


1. Inglot, S. Sprawy gospodarcze Lwa Sapiehy 1588–1607 / S. Inglot // Studia z historii społecznej i gospodarczej poświęconej prof. dr. Fr. Bujakowi. – Lwów, 1931. – S. 165–225.
2. Czwołek, A. Piórem i buławą / A. Czwołek. – Toruń : Wyd-wo Nauk. Un-tu M. Kopernika, 2012. – 734 s.
3. Rachuba, A. Obraz działalności publicznej nielubianego bohatera. Uwagi w związku z pracą Arkadiusza Czwołka o Lwie Sapieże / A. Rachuba // Kwartalnik Historyczny. – 2015. – № 2 – S. 323–346.
4. Rachuba, A. Frakcja Lwa Sapiehy – zarys problematyki / A. Rachuba // Między Lwowem a Wrocławiem. Księga jubileuszowa profesora Krystyna Matwijowskiegó / pod red. B. Roka i J. Maronia. – Toruń, 2006. – S. 503–511.
5. Augustyniak, U. „Stary sługa" jako przedmiot badań nad klientelizmem magnackim na Litwie w XVII wieku / U. Augustyniak // Kwartalnik Historii Kultury Materialnej. – 2010. –№ 1 – S. 71–85.
6. Augustyniak, U. Specyfika patronatu magnackiego w Wielkim księstwie Litewskim w XVII wieku. Problemy badawcze / U. Augustyniak // Kwartalnik Historyczny. – 2002 – № 1. – S. 97–110.
7. Zakrszewski, A. III Statut Litewski a Lew Sapieha / A. Zakrszewski // Studia z deiejów Wielkiego księstwa Litewskiego (XVI-XVIII wieku). – Warszawa : Dig – 2014, – S. 457–464.
8. Скеп'ян, А. Ураднікі і дваране Льва Сапегі ў 80-я XVI – пачатку XVII ст. / А. Скеп'ян // Сапегі: асобы, кар'еры, маёнткі : зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : А. М. Янушкевіч, 2018. – С. 25–49.
9. Саверчанка, І. В. Канцлер Вялікага княства. Леў Сапега / І. В. Саверчанка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 63 с.
10. Чаропка, В. Леў Сапега: Бацька айчыны / В. Чаропка // Уладары Вялікага Княства. – Мінск : Беларусь, 2002. – С. 327–408.
11. Леў Сапега (1557—1633 гг.) і яго час : зб. навук. арт. / Рэдкал.: С. В. Марозава [і інш.]. – Гродна : ГрДУ, 2007. – 422 с.
12. Род Сапегаў // Arche –2016 – № 3. – 481 с.
13. Bagnasco, A. Trust and Social Capital / A. Bagnasco // The Blackwell Companion to Political Sociology / K. Nash, A. Scott (eds.) – Oxford : Blackwell Publishing, 2004. – P. 230–239.
14. Бібліятэка Ўрублеўскага Літоўскай Акадэміі навук (LMAVB). – Адз. Ркпс. F.17 – 106. Квіты Льва Сапегі.
15. Scriptores Rerum Polonicarum / wyd. ks. A. Sokołowski. – Kraków : Nakładem ks. A. Radziwiłła drukarnia W. Anczyca i Spolki, 1885. – T. VIII : Archiwum domu Radziwiłłów. Listy ks. M.K. Radziwiłła, Jana Zamojskiego, Lwa Sapiehy. – 295 s.

16. Якубаў, В. У. Удзел полацкай шляхты і мяшчанства ў знешняй і ўнутранай палітыцы ВКЛ у канцы XVI – пачатку XVII ст. / В. У. Якубаў // Полацк у гісторыі і культуры Еўропы : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Полацк, 22–23 мая 2012 г. / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі ; Полац. дзярж. ун-т ; навук. рэд., уклад. В. М. Ляўко. – Мінск : Беларуская навука, 2012. – С. 166–175.
17. Нацыянальны Гістарычны Архіў Беларусі (НГАБ). – Ф 18. Спр. 85. Арк. 206. Наданне сакаратару каралеўскаму Фрыдрыху Лукомскаму за службу і пасольствы розныя Крычаўскага старасства. Кракаў. 1602.
18. LMAVB. – F.139 – 2584. Фрыдрых Лукомскі да Жыгімонта Вазы з Чарэі. 19.11.1608.
19. Niesiecki, K. Herbarz polski: w X t. / K. Niesiecki. – wydany przez J. Nep. Bobrowicza. – Lipsk : Nakladem i drukem Breitkopfa i Haertela, 1845. – T. X. – 202 s.
20. Boniecki, A. Herbarz polski. Część I. Wiadomości historyczno-genealjgiczne o rodach szlacheckich / A. Boniecki. – Warszawa : skład główny ksęgarnia Gebethnera i Wolffa, 1913. – T. XVI, 108. – 116 c.
21. Wolff, J. Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku / J. Wolff. – Warszawa : Gebethner i Wolff, 1895. – 698 c.
22. НГАБ – Ф. 18, Спр. 86. Арк. 628. Квіт пані падскарбіевай Сафіі Валовічаўне былой Андрэевай Завішавай на 1601000 – 42 злотыя і ўзгадненне лічбы падскарбства пасля смерці яе мужа, у 1605 г. прасіла палічыць і перадаць да скарбу… дэпутатам Т. Сумін Тышкевічу, Сокала Войну, Ярашу Валовічу да Вільні з'ехаўшыхся 17.01.1606. Зацверджана ў Вільні 1.05.1606.
23. НГАБ. – Ф 18. Спр. 86. Арк. 68 Прывілей на кашталянію мсціслаўскую ад 17.07.1598.
24. Беларускі архіў. – Менск : Выд. Белар. акад. навук, 1931. – Т. 3. Менскія акты – 413 с.
25. Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy: t. V: Ziemia połocka i województwo połockie XIV–XVIII wiek / red. H. Lulewicz, , oprac. H. Lulewicz [i in.]. – Warszawa : Wydawnictwo DiG, 2018. – 306 s.
26. Niesiecki, K. Herbarz polski : w IX t. / K. Niesiecki. – wydany przez J. Nep. Bobrowicza. – Lipsk : nakladem i drukem Breitkopfa i Haertela, 1841. – T. VIIII: R–S. – 652 s.
27. LMAVB. – F.139 – 3701. Ліст К. Радзівіла да Л. Сапегі 15.08.1625.
28. Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя : у 3 т. – Т. 2: К — Я / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2006. – 792 с.
29. Niesiecki, K. Herbarz polski: w X t. / K. Niesiecki. – wydany przez J. Nep. Bobrowicza. – Lipsk : nakladem i drukem Breitkopfa i Haertela, 1842. – T. IX. – 468 s.
30. Якубаў, В. У. Кліентэла Льва Сапегі у Полацкім і Віцебскім ваяводстве ў канцы XVI – пачатку XVII ст. [Электронны рэсурс] / В. У. Якубаў // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : электрон. зб. навук. арт. IV Міжнар. навук. канф. да 50-годдзя Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, Полацк, 19–20 крас. 2018 г. ; Полац. дзярж. ун-т ; Пад агул. рэд. А. І. Корсак. – Наваполацк, 2018.. – С. 434–444. – Рэжым доступа: http://elib.psu.by/handle/123456789/23078. – Дата доступа: 10.12.2019.

*Паступіў 13.12.2019*

## SOCIAL CAPITAL IN THE CUSTOMER'S NETWORK LEW SAPIEHA IN THE END OF XVI – THE BEGINNING XVII

***V. YAKUBOV***

*The article is devoted to the structure of social capital in the customer's network of Lew Sapieha. In result of analyzing receiptof the magnatescourt book draws conclusions about versatility of social ties within the social structure. Despite the presence and growth of landed property the basic form of the creation of relations between patron and clients are already cash payments and tissue delivery. In addition, thanks to donations and financial and political support of church dignitaries relatives in the framework of a client network, efforts are visible to create support in the religious and cultural sphere.Political support on the relationships with the Belarusian princely clans led by Drutsk and Lukomsk princes supplemented by the issuance of loans and content on yurgelde representatives of Pac, Volovich, Tyszkiewicz, Zenovich and Chodkiewicz families.*

***Keywords:*** *Lew Sapieha, GDL, magnats, servant nobility, vassal client networks, social capirtal.*